да спадчыны рускага паэта В. Зуёнак падкрэслівае стаўленне да яго як да галоўнага майстра-рыфматворцы. Паказальна, што ўзорныя прыклады з Пушкіна падаюцца не ў арыгінале, а ва ўласным перакладзе В. Зуёнка. Вялікі аматар і знаўца паэзіі рускага генія, беларускі пісьменнік пранікся пушкінскім радкамі настолькі глыбока, каб прамаўляць іх сваёй мовай: "*Эха, бяссонная німфа, блукала над плынню Пенэя. / Феб пабачыў яе і жарсцю пякельнай успыхнуў. / Німфа плод захаплення закаханага бога панесла / І ў пакутах яна нарадзіла паміж гаманлівых наяд, / А дачушку ад маці прымала сама Мнемазіна. / Вырастала дзяўчынка-гарэзніца ў хоры багінь-аанід, / Прыгажосцю – як Эха, – па маці; слухмяная музам; / І на зямлі Рыфмай паэты назвалі яе*" [1, с. 461] ("Рыфма").

Паэтычнае пацвярджэнне значнасці творчай асобы А. С. Пушкіна знаходзім і ў чатырохрадкоўі "Зняверанасць", якое адкрываецца эпіграфам "Звезда печальная, вечерняя звезда…": "*Абманы ў масках цыцэроніі, / Душа нямее ў клетцы птушкаю, – / Ні талісманаў, ні гармоніі… / Вазьму ды пачытаю Пушкіна…*" [Цытуецца па рукапісу В. Зуёнка. – *Н. З.*]. Рэцэпцыя творчасці рускага генія, такім чынам, складае важную ў ідэйна-сэнсавых адносінах частку літаратурнага набытку В. Зуёнка, выяўляе ідэйна-творчыя і эстэтычныя прыярытэты беларускага аўтара.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Зуёнак В. Выбраныя творы. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 512 с.
2. Зуёнак В. Чорная лесвіца: вершы і паэма. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 159 с.
3. Зуёнак В. Ячменнае поле: вершы // Дзеяслоў. – 2013. – № 34. URL: http://dziejaslou.by/old/www.dziejaslou.by/inter/dzeja/dzeja.nsf/htmlpage/zuj3402ec.html?OpenDocument (дата звароту: 17.10.2018).


# РАМАН В. КАЗЬКО "БУНТ НЕЗАПАТРАБАВАНАГА ПРАХУ": ПРАБЛЕМА ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНА ЗАКІНУТАГА ЧАЛАВЕКА


**А. А. Любчанка**

*Аспірант,*
*УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка",*
*г. Мінск, Беларусь*



**Summary.** The article investigates the ways of reflecting the existential problems of abandonment in the novel "Revolt of unclaimed ashes" of the Belarusian writer V. Kazko. Besides abandonment, in the work found other problems of existential philosophy: freedom of choice, loneliness and responsibility of one person to the community as a whole.



**Keywords:** V. Kazko; "Revolt of unclaimed ashes"; abandonment; existentialism.


Віктар Казько з'яўляецца адным з вядучых беларускіх пісьменнікаў сваёй генерацыі, якую часта называюць "сярэднім пакаленнем" ці

пакаленнем дзяцей вайны. Творам В. Казько ўласцівыя аўтабіяграфічнасць, глыбокі псіхалагізм і філасофская напоўненасць, а таксама пастаянны зварот да актуальных праблем чалавецтва, у тым ліку экалагічных. Аўтабіяграфічнасць твораў В. Казько яскрава праяўляецца і ў рамане “Бунт незапатрабаванага праху” (2009), паколькі галоўны герой твора, як і сам пісьменнік, у маладым узросце спазнаў жахі вайны, пасля быў закінуты лёсам у Сібір і там пачуў покліч Бацькаўшчыны, неабходнасць вярнуцца да сваіх каранёў.

У рамане ствараецца атмасфера поўнага хаосу – ва ўзаемаадносінах людзей з іншымі, з прыродай і з самімі сабой. Дзеянне адбываецца на памежжы трох адрозных і адначасова ўзаемазвязаных вымярэнняў – мінулага, сучаснасці і будучыні. Непаслядоўная структура аповеду не заўсёды дазваляе прасачыць храналогію падзей рамана і дакладны ўзрост галоўнага героя на пэўных этапах яго жыцця.

Галоўны герой рамана, Германн Говар, які ў розныя перыяды жыцця зваўся то Жорыкам, то Юрыкам, сам па сабе з’яўляецца сімвалам закінутасці: “А ён з’явіўся сярод людзей. Трапіў у век тэхнічнай і «зялёнай» рэвалюцыі…” [1, с. 15]. Ён жыве з адчуваннем унутранай спустошанасці, бо не ведае свайго сапраўднага імя, сапраўдных бацькоў і месца нараджэння. Шмат год Германн правёў у Сібіры, дзе працаваў і жыў разам з жонкай, якую, як аказалася, таксама ведаў недасканала. Раптоўна ў яго жыцці настаў перыяд, калі ён адчуў сваю бязроднасць і адзіноту як ніколі востра. Германн усё больш і больш адчуваў здзічэласць і непрыкаянасць сваёй душы. Аўтар называе героя ёмістым словам – монстр.

Тлумачэнне, чаму В. Казько непарыўна звязаў галоўнага героя з вобразам монстра, можа быць не адно. Па-першае, сам аўтар піша: “Яго ўжо нідзе не было на зямлі, і быў ён на ёй паўсюдна” [1, с. 10]. Гэтыя словы ўказваюць на згубленасць Германна. Яго ўнутраныя пакуты і перажыванні можна лічыць тыповымі для тысяч дзяцей вайны. Экзістэнцыяльныя праблемы закінутасці чалавека і адсутнасці свабоды выбару ў часы паўсюдных кардынальных змен праяўляліся як ніколі востра, што таксама рабіла з чалавека неакрэсленую істоту, якая не магла самастойна вызначыцца з тым, дзе і кім ёй быць у жыцці. Па-другое, монстр – сімвал патаемнага ўнутранага свету, які кожны чалавек, і Германн у прыватнасці, хавае ад вачэй іншых. Па-трэцяе, “Говар лічыць сябе сапраўдным монстрам, пачварай XX стагоддзя, што ўмудрыўся без каранёў з’явіцца на зямлі і недзе ўкараніцца” [2, с. 111]. З-за сваёй бязроднасці Германн не адчувае сябе паўнапраўным чалавекам. У сваіх жа вачах ён становіцца невызначанай істотай. Германн разумее, што зможа пераўтварыцца ў свядомага чалавека, толькі вярнуўшыся да вытокаў уласнага існавання.

Яшчэ ў юнацтве Германн не адчуваў сябе ўтульна ў месцы, дзе жыў: “Так і не прырос, не прымацаваўся да таго краю, які павінен скарыць, – расце, як куст бузіны недзе ў агародзе пад Кіевам” [1, с. 44]. Ужо тады ён бачыў сябе згубленым і забытым, нібы не меў сапраўднага ўласнага дома, куды заўсёды можна было б вярнуцца, дзе для яго заўсёды знойдзецца месца. У той час Жорка, які з цягам часу стаў Юркам, яшчэ не ўсведамляў сябе монстрам. Нечакана для ўсіх ён прыняў рашэнне пакінуць бацькоўскую хату, каб згубіцца ў глыбінях Сібіры і працы: “Ён скарыўся і ўлёг у працу, як заснуў” [1, с. 51].

“Хто ж ён на самай справе, дзе і калі нарадзіўся? І ці нарадзіўся?” [1, с. 51], – такія думкі ўсё больш турбавалі Германна. Гэта было не беспадстаўна, паколькі ён памятаў: “У мінулым сваім жыцці, яшчэ вясковым, краем вуха чуў нямала плётак і нагавораў на сябе” [1, с. 51]. Тыя плёткі былі звязаны з паходжаннем Германна, з яго сапраўднымі іменем і гісторыяй. Германн падазраваў, што яго імя і прозвішча яму “падсунулі”. Аказалася, што прыёмны бацька знайшоў хлопчыка ў лесе, калі ўцякаў ад ворагаў, а сапраўднае імя Жорыка-Юрыка-Германна – Макрыян.

У рамане “Бунт незапатрабаванага праху” выяўляюцца тыповыя праблемы пакалення “дзяцей вайны”: страта сябе, адчуванне экзістэнцыяльнай закінутасці і адзінота ў пошуках уласнага “я”. Германн Говар, які быў суцэльна згубленым чалавекам, прайшоў шлях ад маральнай спустошанасці да духоўнага адраджэння праз вяртанне да вытокаў свайго існавання. У творы знаходзіць адлюстраванне матыў блукання згубленага чалавека, якое павінна скончыцца там, дзе ён нарадзіўся. Згодна з В. Казько, вяртанне да каранёў дае надзею на знішчэнне бездухоўнасці і маральны ўздым у грамадстве.

Праблема экзістэнцыяльнай закінутасці ўспрымаецца ў рамане як асабістая трагедыя чалавека, які меў няшчасце нарадзіцца не ў тым месцы і не ў той час. Разам з тым, у творы знаходзіць адлюстраванне тэма негатыўнага ўплыву чалавека на экалогію, што сімвалізуе заняпад маральных каштоўнасцей ў грамадстве. Забруджванне навакольнага асяроддзя не спрыяе развіццю чалавека. Тэхнічны прагрэс заводзіць чалавецтва занадта далёка, асоба губляе маральныя арыенціры, што вядзе да бязроднасці і спустошанасці, а значыць – закінутасці. Наяўнасць у рамане тэм жыцця і смерці, узаемаадносінаў паміж пакаленнямі, экзістэнцыяльнай свабоды чалавека і яго адчужанасці ўдакладняе і пашырае межы разважанняў аўтара пра месца чалавека ў свеце.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Казько В. Бунт незапатрабаванага праху: раман. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 287 с.
2. Навасельцава Г. Абнаўленне прыёмаў паэтыкі рамана ў беларускай прозе XXI стагоддзя (на прыкладзе твораў Віктара Казько «Бунт незапатрабаванага праху» і Юрыя Станкевіча «Ліст у галактыку “Млечны шлях”») // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2016. – № 4 (97). – С. 110–114.